**ЗАКЛЮЧЭННЕ**

савета па абароне дысертацый К 02.21.01 па дысертацыі Мусіенкі Васіля Анатольевіча

**«Семантычная дэрывацыя ў сферы ментальных намінацый: на матэрыяле беларускай і англійскай моў»**

**Спецыяльнасць і галіна навукі, па якой прысуджана вучоная ступень.** Дысертацыя Мусіенкі Васіля Анатольевіча «Семантычная дэрывацыя ў сферы ментальных намінацый: на матэрыяле беларускай і англійскай моў» з'яўляецца кваліфікацыйнай навуковай працай і адпавядае спецыяльнасці 10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства і галіне – філалагічныя навукі.

**Навуковы ўклад саіскальніка ў рашэнне навуковай задачы з ацэнкай яе значнасці.**

Дысертацыя В. А. Мусіенкі ўяўляе сабой першае супастаўляльнае даследаванне беларускіх і англійскіх другасных ментальных намінацый: у ёй вызначаны дамінантныя групы другасных ментальных адзінак з улікам суадносін абласцей фрэйма-крыніцы і сферы-рэцыпіента; выяўлена спецыфіка семантычнай дэрывацыі ў розных лексіка-граматычных разрадах слоў; устаноўлены асноўныя ментальныя мадэлі ў сэнсавых структурах беларускіх і англійскіх намінацый; устаноўлены асноўныя заканамернасці і напрамкі семантычнага развіцця працэсаў мыслення, пазнання, запамінання, разумення і ўяўлення, а таксама спецыфіка сінтаксічнай спалучальнасці дзеяслоўных адзінак з субстантывамі; выяўлены тыпалагічнае падабенства і нацыянальна-культурныя адрозненні беларускіх і англійскіх ментальных лексічных адзінак.

**Канкрэтныя навуковыя вынікі, за якія саіскальніку прысуджана вучоная ступень.** Савет па абароне дысертацый К 02.21.01 прысуджае Мусіенку Васілю Анатольевічу вучоную ступень кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства **за:**

– выяўленне і сістэматызацыю поўнага корпуса другасных ментальных лексіка-семантычных варыянтаў у іменных і дзеяслоўных намінацыях беларускай і англійскай моў (642 лексічныя адзінкі ў беларускай мове, 636 – у англійскай), засведчаных у больш за 2100 кантэкстах, і стварэнне на гэтай аснове «Беларуска-англійскага тлумачальнага слоўніка другасных ментальных намінацый»;

– устанаўленне спецыфікі семантычнай дэрывацыі ў розных лексіка-граматычных разрадах слоў і асноўных ментальных мадэлей у субстантывах, ад'ектывах і дзеясловах беларускай і англійскай моў;

–семантычную класіфікацыю ментальных ад'ектываў у адпаведнасці з характарам праецыравання зыходнай паняційнай сферы, адзначанай параметрычнымі, каларатыўнымі, люмінальнымі, тэмпературнымі, кансістэнтнымі, густаторнымі, вагавымі, гукавымі, адарычнымі і іншымі маркерамі, на рэцыпіентную ментальную сферу;

– вылучэнне складу дзеяслоўнага ментальнага кантынуума (пяці груп дзеясловаў са значэннем мыслення, пазнання, памяці, разумення і ўяўлення), які ўключае 77 суадносных пар у беларускай і англійскай мовах;

– вызначэнне спецыфікі сінтаксічнай спалучальнасці субстантыва *думка (thought)* з акцыянальнымі, часавымі, прасторавымі, тэмпературнымі, люмінальнымі і іншымі дзеясловамі, якія ў розных тэкставых фрагментах дэманструюць пэўныя аспекты ментальнага працэсу і яго разгортванне ў часе і прасторы;

– устанаўленне тыпалагічнага падабенства і нацыянальна-культурных адрозненняў рэпрэзентацыі другасных ментальных намінацый у беларускай і англійскай мовах (семантычная эквівалентнасць, частковае несупадзенне, безэквівалентнасць лексічных адзінак).

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў даследавання.** Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыі могуць выкарыстоўвацца пры далейшай распрацоўцы праблем семантычнай дэрывацыі, семасіялогіі, лінгвістычнай тыпалогіі. Атрыманыя вынікі могуць знайсці выкарыстанне ў адукацыйным працэсе пры выкладанні беларускай і англійскай моў, агульнага мовазнаўства, тэорыі і практыкі перакладу, напісанні дыпломных і магістарскіх работ, а таксама ў лексікаграфічнай і перакладчыцкай практыцы (пры сістэматызацыі слоўнікавых дэфініцый у тлумачальных і двухмоўных слоўніках, складанні тэматычных, ідэаграфічных і перакладных слоўнікаў).

Намеснік старшыні савета
па абароне дысертацый — Н.У.Чайка

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый — Д.В.Дзятко

05.10.2022